# Урок гісторыі Беларусі ў 8 “Б” класе
# з выкарыстаннем гісторыка–краязнаўчага кампанента

***Настаўнік Крывапуст Алена Аляксандраўна***

**Тэма** : Прамысловасць, гандаль, гарады і мястэчкі ў Беларусі ў першай палове XIX ст.

**Дыдактычная мэта ўрока:**

Плануецца, што да канца ўрока вучні будуць **ведаць:**

- новыя з’явы ў прамысловым развіцці Беларусі – з’яўленне першых фабрык;
- шляхі зносін : шашэйныя, рачныя, найбольш значныя кірмашы і іх ролю ў гандлі;
- гарады і мястэчкі Беларусі;
- сацыяльна – эканамічнае развіцце Століншчыны першай паловы XIX ст. на прыкладзе развіцця Д–Гарадка і Гарадной.

Вучні павінны **ўмець:**

- характарызаваць сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у першай палове XIX ст.
- паказваць на гістарычнай карце месцы вывучаемых гістарычных падзей;
- раскрываць сутнасць гістарычных паняццяў;
- раскрываць прычынна-выніковыя сувязі;
- даследаваць, рыхтаваць і прэзентаваць дадатковы матэрыял аб сацыяльна -эканамічным развіцці Століншчыны першай паловы XIXст.

**Задачы асобаснага развіцця:**

- Развіццёвая:
  фарміраваць гістарычнае мысленне, садзейнічаць развіццю ўменняў характарызаваць гістарычныя з’явы і дзейнасць гістарычных асоб, тлумачыць прычынна –выніковыя сувязі, фарміраваць картаграфічныя ўменні і навыкі, уменні праводзіць аналіз зместу дадатковай літаратуры ў працэсе пошуку неабходнай інфармацыі, развіваць інтэлекуальныя здольнасці ў працэсе пазнавальнай дзейнасці.
- Выхаваўчая:
  стварыць умовы для выхавання грамадзянскага патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці, фарміравання пазнавальнага інтарэсу да мінулага свайго краю.

**Тып урока** - урок засваення новых ведаў

Забеспячэнне ўрока:

1) Насценная карта: "Беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі"
2) Вучэбны дапаможнік для 8 класа пад рэдакцыяй У.А.Сосны
3) Гісторыка – дакументальная хроніка "Памяць. Столінскі раён"
4) І К Т

## Ход урока

**I. Арганізацыйны момант**

(прывітанне, пажаданне добрага настрою, актыўнай працы на ўроку )

**II. Работа над матэрыялам новай тэмы:**

**1**. Аб'яўленне тэмы ўрока, пастаноўка мэты ўрока вучнямі;
**2.** Работа па плану:
Рубрыка "Успомніце"
**3**.Формы прамысловай вытворчасці і пачатак прамысловага перавароту

**4.**Развіццё шляхоў зносін і гандлю. Роля кірмашоў.

**5.**Гарады і мястэчкі Беларусі.

**3. Гімнастыка для вачэй**

**III.** Экскурс у гісторыю кнігі "Памяць. Столінскі раён"
сацыяльна – эканамічнае развіццe Століншчыны
першай палове XIX ст.

**IV. Канкрэтызацыя вывучанага матэрыялу:**

(вяртанне да мэты ўрока )

## Тэставае заданне і ўзаемаправерка заданняў вучнямі

**Завяршыце сказы:**

1.Прадпрыемства, заснаванае на падзеле працы і машыннай вытворчасці…….
2.Першыя ў Беларусі фабрыкі былі пабудаваны ў мястэчках …………і………
3.На фабрыках працавалі ………………..сяляне
4.Фабрыкі належалі ……………………

5.З’яўленне першых фабрык сведчыла аб пачатку …………………перавароту
6.Важную ролю ў гандлі працягвалі адыгрываць ……………
7.У першай палове XIX стагоддзя ў Беларусі налічвалася ……гарады
8.Насельніцтва гарадоў было ……………….. ……і……………………………
9.Большую частку гараджан складалі ……...
10.Значнымі цэнтрамі гандлю і рамяства на Століншчыне былі…………..

**Адказы :**

1.Фабрыка
2. Хомск і Косава
3.Прыгонныя
4. Памешчыку Войцеху Пуслоўскаму
5. Прамысловага
6. Кірмашы
7. 42
8. Шматканфесійным і шматэтнічным
9. Яўрэі
10.Д-Гарадок і Гарадная

**V. Дамашняе заданне :**
§ 8, работа над пытаннямі і заданнямі пасля параграфа № 2, 4, 6 сс. 38-39;
**Дадатковыя заданні** : работа з QR –кодам с.38;
зад. № 3 с.38 (з выкарыстаннем метадычнай парады с.155).

## VI. Рэфлексія
## Сёння на ўроку :

**“ Было цікава….”**

**“ Я змог (змагла)…”**

**“ Мяне здзівіла….”**

**“ Было складана…”**

**“ Я зразумеў (зразумела)…..”**

**“ Я хацеў бы (хацела б) пахваліць….”**